

Наша тэатральная кавярня атрымала назву “Аўстэрыя Уршуля” ў гонар Францішкі Уршулі Радзівіл (1705-1753) з роду князёў Вішнявецкіх — заснавальніцы прыдворнага Нясвіжскага тэатра, першай жанчыны-драматурга Вялікага Княства Літоўскага, кавалера ордэна Зорнага Крыжа, жонкі ўладальніка Нясвіжскай ардынацыі Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі. Менавіта з нясвіжскіх падмосткаў распачалася гісторыя прафесійнага тэатра на беларускіх землях. Францішка Уршуля Радзівіл сама пісала тэксты, ставіла спектаклі, распрацоўвала дэкарацыі. Усе п'есы княгіні былі надрукаваныя пасля яе смерці асобнай кнігай пад назвай “Камедыі і трагедыі”. Гэтае выданне было аздоблена ілюстрацыямі нясвіжскага гравёра Міхала Жукоўскага, выявы якіх упрыгожваюць сцены Аўстэрыі.

Энергічная, добра адукаваная гаспадыня Нясвіжа займалася гаспадаркай, выхаваннем сына, які застанецца ў гісторыі як славуты Пане Каханку, і адначасова дбала пра аднаўленне нясвіжскай друкарні, ўпарадкаванне княскай бібліятэкі. Францішка Уршуля пакінула пасля сябе багатую літаратурную спадчыну на польскай і французскай мовах: драматычныя творы, сатырычныя, рэлігійныя і любоўныя вершы, загадкі і нават маральна-філасофскія трактаты.

На падставе трох тэкстаў княгіні Уршулі – “Дасціпнае каханне”, “Распуснікі ў пастцы” і “Шчаслівае няшчасце” ў нашым тэатры пастаўлены спектакль “Выкраданне Еўропы, альбо Тэатр Уршулі Радзівіл”, які, адпаведна дасціпнай задуме аўтаркі, складаецца з балета, камедыі і оперы.


A MAP OF
THE KINGDOM OF POLAND
AND GRAND DUTCHY OF LITHUANIA
INCLUDING SAMOGITIA AND CURLAND,
Divided according to THEIR DISMEMBERMENTS
with THE KINGDOM OF PRUSSIA
By WILLm FADEN Geographer to THE KING
MDCCXCIX.
BALTIC OF EAST SEA
LIVONIAN GULF
GULF OF RIGA
GULF OF DANTZICK
Russian
Prussian
Imperial
PALATINATE OF POLOCK
PALATINATE OF WILNO
LITHUANIA
PALATINATE OF WOLHYNIA
WARSZAWA
WARSAW
MOLDAVIA


NESDISIVM
1 Arx Principis
2 Templu Corporis Christi
3 Collegium soci. Iesu
4 Monast. ord. minoru de observantia
5 Monast S. Euphemie monialium
6 Pistorium
7 Hospitale S Spirit9
8 Templum Graecorum
9 S. Lazari
10 Domus Capitanei
11 Domus Parochi
12 Porta Mirdensis
13 Porta Sluczkum versus